ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
23.06.2020 № 145

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Сям’я і шлюб беларусаў: гісторыя і сучаснасць» для X (XI) класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Сапраўдная вучэбная праграма прызначана для X або XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Сапраўдная вучэбная праграма разлічана на 35 гадзін (1 гадзіна ў тыдзень).

3. Мэта – фарміраванне ўяўленняў аб сям'і як традыцыйнай каштоўнасці, як асноўнай крыніцы ўзнаўлення і выхавання новых пакаленняў беларусаў, захавання іх нацыянальнай самабытнасці.

4. Задачы:

вывучэнне гісторыі сям'і і шлюбу, традыцыйнай сямейнай абраднасці (у тым ліку сямейна-шлюбных традыцый беларускай шляхты, сялян, гараджан) у розных рэгіёнах Беларусі, асноў этнапедагагічнай спадчыны беларускага народа;

разгляд сучаснага стану сям'і і сямейна-шлюбных адносін, іх прававой рэгламентацыі, асноўных адаптацыйных стратэгій сучаснай сям'і;

фарміраванне зацікаўленасці старшакласнікаў вывучэннем гісторыі і традыцый сваіх уласных сем'яў, азнаямленне з асноўнымі метадамі і прыёмамі такіх даследаванняў;

фарміраванне і развіццё ў школьнікаў уменняў і навыкаў праектнай, вучэбна-даследчай працы;

спрыянне выхаванню нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызма (павагі да гістарычнага мінулага, культуры і мовы роднай зямлі, любові да родных мясцін, сваіх блізкіх).

5. Рэкамендуемыя формы і метады навучання: форма правядзення факультатыву прадугледжвае арганізацыю ў максімальнай ступені самастойнай практыка-арыентаванай дзейнасці вучняў (даследчую працу над праектамі, звязанымі з праблематыкай факультатыўных заняткаў (па жаданні навучэнцаў), прэзентацыю вынікаў індывідуальных і калектыўных праектаў, арганізацыю экскурсій у мясцовыя музеі).

6. Вучні, якія асвоілі змест сапраўднай вучэбнай праграмы, павінны:

6.1. ведаць:

гісторыю сям'і і шлюбу ў Беларусі;

традыцыйную сямейную абраднасць беларусаў;

асновы этнапедагагічнай спадчыны беларускага народа;

сучасны стан сям'і і сямейна-шлюбных адносін;

6.2. умець праводзіць даследаванне па гісторыі ўласнай сям'і (фармуляваць праблему, ажыццяўляць збор, сістэматызацыю і

абагульненне факталагічнага матэрыялу, рабіць прэзентацыю вынікаў асабістага пошуку).

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Тэма 1. Уводзіны (1 гадзіна)

Азнаямленне са зместам факультатыўных заняткаў. Тэарэтычныя асновы. Мэта, задачы, структура факультатыўных заняткаў. Асноўная літаратура. Тэматычны план заняткаў. Размеркаванне індывідуальных і групавых заданняў.

Тэма 2. Беларуская сям'я і сямейныя адносіны: гісторыя і сучасны стан (12 гадзін)

Гісторыя сям'і і шлюбу ў Беларусі. Фукцыі сям'і. Формы і віды сям'і. Малая сям'я. Віды малой сям'і: элементарная шлюбная пара, нуклеарная сям'я, ускладнёная малая сям'я. Вялікая сям'я. Віды вялікай сям'і. Вялікая бацькоўская сям'я: адналінейная бацькоўская сям'я; шматлінейная бацькоўская сям'я. Вялікая брацкая сям'я. Сем'і са здольнікамі, сем'і з шурынамі. Іншыя сямейныя аб'яднанні: сямейныя кааперацыі. Сям'я і сямейны побыт беларусаў у XIV – першай палове XVII ст. Асаблівасці традыцыйнай беларускай сям'і і сямейнага побыту беларусаў у другой палове XVII – першай палове XIX ст. Традыцыйная сялянская сям'я ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Беларуская гарадская сям'я ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Шляхецкая сям'я ў Беларусі.

Узаемаадносіны ў традыцыйнай беларускай сям'і. Маёмаснае становішча мужчын і жанчын у традыцыйнай беларускай сям'і. Права вена. Вена пасажнае, вена адпіснае. Залежнасць унутрысямейных адносінаў ад формы сям'і. Сямейныя адносіны ў вялікай бацькоўскай сям'і. Роля і функцыі старэйшай гаспадыні ў вялікай сям'і. Іерархія нявестак у вялікай бацькоўскай сям'і. Размеркаванне відаў працы паміж нявесткамі ў вялікай сям'і. Падзел працы: мужчынскія і жаночыя віды працы, падзел працы ў залежнасці ад пары года і палявога сезона. Традыцыйны распарадак дня. Сямейныя трапезы. Сямейны этыкет. Эвалюцыя унутрысямейных адносінаў.

Беларуская сям'я і сямейныя адносіны ў сучаснасці. Мадэрнасць як фактар змянення формаў сям'і. Прававая рэгламентацыя сямейна-шлюбных адносін у Рэспубліцы Беларусь. Адносіны ў беларускай сям'і ў сучаснасці. Некаторыя адаптацыйныя стратэгіі сучаснай сям'і паводле дасдедаванняў беларускіх навукоўцаў: стратэгія збераження

каштоўнаснай асновы традыцыйнай сям'і; стратэгія сямейнага выхавання на традыцыях народнай педагогікі; стратэгія рэпрадукцыйнага здароўя сям'і і забеспячэння здаровага ўкладу жыцця; стратэгія развіцця сямейнага турызму і краязнаўства.

Тэма 3. Беларуская традыцыйная сямейная абраднасць (14 гадзін)

Беларуская традыцыйная радзінная абраднасць. Дародавыя абрады і звычаі беларусаў. Забароны падчас цяжарнасці. Статус цяжарнай жанчыны у традыцыйным беларускім грамадстве. Цяжарная жанчына ў традыцыйнай абраднасці.

Абрады, звязаныя з родамі. Сімволіка прадметаў матэрыяльнай культуры ў радзіннай абраднасці. Стол. Ручнік. Пояс. Соль. Вада. Мужчыны ў традыцыйнай радзіннай абраднасці. Абрадавыя дзеянні з пупавінай як сродак канструявання чалавека. Асаблівасці ўспрымання часу і прасторы і іх уплыў на радзінныя звычаі. Фактары вызначэння лёсу чалавека: час нараджэння, надвор'е, фаза месяца, дзень тыдня, месяц, пара года і гэтак далей.

Пасляродавы комплекс звычаяў і рытуалаў. Бабка-павітуха. Наведванне парадзіхі. Кумы. Хрышчэнне дзіцяці. Царкоўнае хрышчэнне як культурнае нараджэнне. Хрэсьбіны. Бабіна каша. Паводзіны парадзіхі на хрэсьбінах. Рытуальныя пераапрананні. Абрадавыя гульны на хрэсьбінах. Абрады ачышчэння парадзіхі і бабкі-павітухі. Муравінкі. Канструяванне чалавека ў радзінных абрадах.

Эвалюцыя традыцыйнай радзіннай абраднасці. Беларуская традыцыйная вясельная абраднасць. Шлюбныя стратэгіі ў традыцыным беларускім грамадстве. Віды шлюбаў. Шлюбны ўзрост. Бязшлюбнасць і адносіны да несямейных у традыцыйным беларускім грамадстве.

Давясельны комплекс звычаяў і абрадаў. Падрыхтоўчы этап беларускага вяселля. Выбар нявесты. Гаданні пра поспех сватаўства. Перапросіны. Свахі. Сватанне. Рытуальныя паводзіны сватоў; нявесты; бацькоў нявесты. Мова гандлю як сродак перамоваў падчас сватання. Барыш. Рытуальныя стравы ў давясельнай абраднасці. Заручыны ці вялікія запоіны. Абмен падарункамі. Заручальныя пярсцёнкі. Шлюбная дамова. Суборная субота. Абрадавае шлюбнае дрэўца (гільца). Вясельны вянок. Вясельныя ўпрыгожванні. Хлапечнік. Каравайная абраднасць. Абрадавыя чыны ў каравайных рытуалах. Каравайніцы. Каравайныя песні. Сімволіка каравая. Упрыгожванне каравая. Гускі і гусарніцы.

Стаўбавы вясельны абрад. Лакалізацыя, асаблівасці стаўбавога абраду.

Пасад маладых. Ад’езд жаніха за нявестай. Выкуп нявесты. Бласлаўленне маладых бацькамі. Вянчанне. Прыкметы падчас вянчання. Магія ўрадлівасці падчас вяселля.

Вяселле ў доме нявесты. Сустрэча маладых. Выкуп месцаў. Падзел каравая. Сімволіка падзела каравая і яго асобных частак. Адорванне маладых.

Вяселле ў доме жаніха. Засвойванне новай прасторы маладой. Перамена прычоскі маладой. Праверка здольнасцяў і ўменняў маладой. Абрадавае пераапрананне. Запарожцы.

Паслявясельная абраднасць. Пярэзвы (адозвы). Маладыя ў каляндарнай абраднасці беларусаў.

Эвалюцыя традыцыйнай вясельнай абраднасці.

Беларуская традыцыйная пахавальна-памінальная абраднасць. Уяўленні аб смерці ў беларускім традыцыйным грамадстве. Уяўленні пра адыход душы.

Традыцыі падрыхтоўкі да пахавання. Абраднасць пахавання. Правілы паводзінаў блізкіх. Дапамога грамады ў пахавальнай абраднасці.

Памінкі. Паняцце Долі ў традыцыйнай пахавальна-памінальнай абраднасці. Рытуальныя даты: 1 дзень, 3 дні, 9 дзён, 40 (30) дзён, 1 год пасля пахавання. Памінальны стол. Абрадавыя стравы.

Традыцыі памінання продкаў у беларускай культуры. Дзяды. Калядныя дзяды, Радуніца, Траецкія дзяды, асяніны, задушны дзень.

Эвалюцыя традыцыйнай пахавальна-памінальнай абраднасці.

Тэма 4. Этнапедагагічная спадчына беларускага народа (7 гадзін)

Уводзіны ў народную педагогіку. Што такое народная педагогіка? Асноўныя сродкі народнай педагогікі. Асноўныя ідэі этнапедагагічнай спадчыны беларусаў (працоўнае, разумовае, маральнае, рэлігійнае, эстэтычнае, патрыятычнае, фізічнае выхаванне).

Сям’я беларусаў як інстытут выхавання. Полаўзроставыя ступені дзяцінства, сімвалічныя межы ўзроставай перыядызацыі і абрады пераходу. Традыцыйныя формы і метады, спосабы і прыёмы сямейнага выхавання, роднасна-сваяцкія адносіны беларусаў у кантэксце народнай педагогікі, дзіцячы побыт, гульні і забавы, дзеці ў вераваннях і абрадах. Выхаваўчыя традыцыі шляхты, сялян, гараджан. Традыцыі дашлюбных зносін і падрыхтоўкі да шлюбу. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання дзяцей у беларусаў.

Выніковае падагульненне. Роля сям’і ў жыцці чалавека і грамадства. Інстытут сям’і як першасны асяродак узнаўлення народа, сацыялізацыі і этнізацыі малодшых пакаленняў, перадачы сацыякультурнага досведу.

Творчыя індывідуальныя і групавыя заданні (па жаданню навучэнцаў):

конкурс малюнкаў «Дрэва сямейных каштоўнасцей»;

праект «Адкуль мой род» (праца над радаводам);

праект «Сямейны фотаальбом» (праца над ўпарадкаваннем сямейных фотаздымкаў);

праект «Сямейныя гісторыі» (збор вусных успамінаў);

праект «Мае продкі, якімі я ганаруся»;

праект «Гульні і забавы ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі: традыцыі і навацыі» (паведамленні, майстар-класы, спартландыя).

Рэзервовы час (1 гадзіна)